БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 25 (72)
верасень
2008 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.

Вялікая дарога

с.2



ТЭАТР
с.3

сустрэча
с.4

РОД
с.5

KAMUNIKAT.org

08/09/2008

Дарога патрабуе дысцыпліны

8 верасня 2008 года ў Магілёўскім раёне праходзіў рэйд па забеспячэнню бяспекі дарожнага руху. У Брылях на скрыжаванні вуліц Першамайскай і Юбілейнай працаваў мабільны пост абласной Дзяржаўтаінспекцыі. Маёр Сурын Павел Уладзіміравіч і старшы лейтэнант Стрынадка Зміцер Віктаравіч уважліва сачылі за нешматлікімі аўтамабілямі і, калі патрабавалася, спынялі іх, правяраючы дакументы. Вядома ж, усё гэта зацікавіла мясцовых жыхароў, асабліва моладзь, якія спачатку здаля назіралі за дзеяннямі міліцыянераў, а потым падышлі бліжэй. І завязалася цікавая і добразычлівая гутарка пра неабходнасць дысцыпліны на дарозе, пра флікеры, пра вядомую аперацыю ДАІ "Мінус 100", якая зберагла шмат жыццяў, і нават пра спраўнасць тых веласіпедаў, на якіх сюды пад'ехалі некаторыя падлеткі. Адным словам, рэйд ДАІ ў нашых Брылях атрымаў добрае практычна--выхаваўчае напаўненне.

Мікола ЯЦКОЎ.

Фотаздымкі аўтара.

Маёр Павел Сурын, Зміцер Васюрэнка, Аляксей Паршнёў, Сяргей Бураеў, Ала Яцкова, Марыя Шыманоўская, Кастусь Чэчуноў, старшы лейтэнант Зміцер Стрынадка, Яна Какоўка, Станіслаў Васюрэнка.

Куклы і правілы

Можна па-рознаму казаць аб нечым важным і неабходным. Калі гэта Правілы дарожнага руху, то патрабуецца дакладнасць і нагляднасць. А, напрыклад, дзецям аб складаным трэба расказваць і паказваць ясна і проста. Менавіта па гэтаму шляху пайшоў Магілёўскі абласны тэатр лялек, стварыўшы спектакль «*Авария, или Приключения на большой дороге*». 6 верасня 2008 года героі гэтай п'есы абжылі сцэну Брылеўскага сельскага Дома культуры і ў яркай, лялечна-гумарыстычнай форме расказалі маленькім брылеўцам пра тое, што з правіламі дарожнага руху трэба сябраваць. Гледачы вельмі добра і непасрэдна ўспрымалі ўсё, што адбывалася на сцэне. І хочацца спадзявацца, што дзецям шмат што запомніцца, а ў пэўных жыццёвых сітуацыях абавязкова дапаможа прыняць правільнае рашэнне.

Вольга МАЙБУРАВА.

Фота Міколы Яцкова.

Наталля Кудзіна і Надзея Валяева.



Максім Кошалеў і Сяргей Сяргеенка.

КУМУНІКАТ.ОРГ

Наша Таня

У Магілёўскім абласным тэатры лялек білетным кантралёрам працуе Таццяна Пятроўна Сухавій. Брылеўцам гэтае украінскае прозвішча ні аб чым не кажа. Але калі нашы людзі чуюць, што пад ім "схавалася" Таня Карась, то ўсё становіцца на свае месцы. Бо ў свой час жыла ў Брылях дружная сям'я Карасей: Пётр Рыгоравіч працаваў у калгасе імя Ільіча галоўным аграномам і старшынёй прафкама, Людміла Аляксееўна выкладала біялогію і хімію ў Брылеўскай школе, і было ў іх трое дзяцей -- Пётр, Сяргей і Таццяна. У 1986 годзе сям'я пераехала спачатку ў суседнюю вёску Сухары, а потым у вёску Вайнілы што ў Чавускім раёне. І там засталася назаўсёды.



Таццяна Сухавій (Карась) у Брылях ля роднага дома. *Верасень 2008 г.*

Таццяна скончыла бібліятэчны тэхнікум, працавала ў Вайнілах у бібліятэцы, а потым кіравала мясцовым аддзяленнем сувязі. Пазнаёмілася з Сяргеем Сухавіем. Адзвінела вяселле, і маладая сям'я пераехала ў г. Бярэзіно Мінскай вобласці. А паколькі шляхі лёсу часта бываюць неспадзяванымі, то так атрымалася, што зараз Таццяна, Сяргей і іх 11-гадовая дачка Яніна жывуць у Магілёве. І магілёўскі тэатр лялек прыняў пад сваё крыло нашу Таню...

І калі лялечнікі часам завітваюць да нас у Брылі (як гэта было літаральна днямі -- у суботу, 6 верасня), то Таццяна заўсёды разам з імі. І ніколі не мінае магчымасці зноў падысці да роднага дома № 15 па вуліцы Юбілейнай, кінуць позірк на такія знаёмыя вокны і ўспомніць далёкія гады свайго сонечнага дзяцінства. А потым абавязкова спяшаецца да сваёй лепшай сяброўкі Людмілы Бураевай -- перакінуцца парай слоў і пачуць брылеўскія навіны...

А ў нас ёсць магчымасць зазірнуць у мінулае -- угледзецца ў пажоўклы ад часу фотаздымак. І настальгічна зразумець, што жыццё не стаіць на месцы...

Мікола ЯЦКОЎ.

ТРЭЦІ КЛАС БРЫЛЕЎСКАЙ ШКОЛЫ.
1984 г.
Першы рад
(злева направа):
Аляксандр Акуліч,
Валерый Бураеў,
Аляксандр Іваноў,
Васіль Мажаеў.
Другі рад:
Надзея Уханава,
Марына Смалякова,
Аляксандр Майсцер,
Любоў Ісаева,
Людміла Мяшкова.
Трэці рад:
Іна Інчанка,
Алена Патапава,
Жана Пагуляева,
Таццяна Карась.
Разам з вучнямі настаўніца Людміла Васільеўна.

Фотаздымак з архіва Л. Л. Бураевай (Мяшковай)

Нашчадкі шляхецкага роду

Честь имею

6 верасня 2008 года газета "СБ Беларусь сегодня" надрукавала вялікі артыкул *"Честь имею"*, які даслаў у рэдакцыю намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага тэхнікума імя А.С.Пушкіна Ігар Антонавіч Волкаў. Паколькі "СБ" надрукавала артыкул у скарочаным выглядзе, прапануем вашай увазе поўны аўтарскі тэкст І.Волкава і спадзяемся, што чытачы "Брылеўскага летапісу" з захапленнем пагартаюць старонкі гісторыі знакамітай сям'і.

Ала ЯЦКОВА,
бібліятэкар Брылеўскай бібліятэкі.

Честь имею

Эта история произошла во времена I мировой войны. На российско-германском фронте шли ожесточенные бои. В одном из таких боев 20 июля 1915 под городом Остров был тяжело ранен и потерял руку мой прадед Бронислав Станиславович Волков-Карачевский. Тяжело раненый, без сознания он попал в плен, но через некоторое время был из него освобожден…

Госпиталь, в котором находился на лечении Бронислав Станиславович, размещался в Петрограде. 18 мая 1916 года в госпиталь приехала наградная комиссия во главе с Государем, среди представленных к награде был и мой прадед…

Когда в палату вошел Николай II, все, даже те, кто был

Император Николай II

тяжело ранен, встали. Царь попросил раненых присесть. Штабной офицер зачитал: *"Пулеметчик 233 Старобельского полка Волков-Карачевский Бронислав Станиславович!"* Прадед встал, ответил по Уставу. Взгляд Николая II пересекся со взглядом отважного солдата, сурово смотревшего на комиссию. И под наградной Указ, читаемый генералом, Государь, подойдя к воину, лично прикрепил к его груди Георгиевский крест… Было в то время Георгиевскому кавалеру 22 года…

Потом был разговор о фронте, о дальнейшей войне, о планах на жизнь после госпиталя. Царь предложил ему квартиру в Петрограде, но солдат поблагодарил и сказал, что хочет вернуться на родную сторону. Николай II тут же подозвал штабного офицера и приказал за счет государственной казны поставить дом в родной стороне солдата и назначить пожизненную пенсию.

Вернувшись домой из госпиталя, Бронислав Станиславович женился на уроженке деревни Луполово Ковзан Анне Станиславовне, поставил дом. Согласно царскому Указу все расходы взяло на себя государство, -- и по сей день стоит этот дом в деревне Каменка Брылевского сельского совета.

После революции и «белые», и «красные» обходили сурового Бронислава стороной. Человек он был верующий, все католические и православные праздники чествовались в его семье: сам он был католик, супруга – православная. Он не позволял глумиться над святой верой, отбирал иконы у «активистов» и раздавал верующим людям. Однажды увидев у одного из таких безбожников распятье Христа с отбитой рукой, отобрал и, смахнув скупую мужскую слезу с глаз, сказал: «Он такой же здесь, как и я, -- без руки»…

Шло время. В 1940 ушел в Рабоче-Крестьянскую Красную Армию старший из семи детей Бронислава Станиславовича и

Бронислав Станиславович Волков-Карачевский

Анны Станиславовны -- сын Казимир. В июне 1941 года в Прибалтике Казимир встретил войну.

Во время войны Бронислав Станиславович и Анна Станиславовна приютили несколько семей беженцев из Ленинграда, который жили с ними до конца войны. (Потом, после войны, уже когда Бронислав Станиславович умер, благодарные ленинградцы часто заезжали наведать Анну Станиславовну).

Полыхала война. Сын Казимир воевал, приближая час Великой Победы. С раннего детства приученный к труду, он во всём брал пример со своего отца - Георгиевского кавалера. Старшина пулеметной роты Казимир Брониславович Волков, познавший су-

ровые испытания, плен, горечь утрат и радость Победы, с честью пронес через годы войны фамилию своего старожитного шляхетского рода Волковых - Карачевских и вернулся с войны лишь в 1947 году.

Помог родителям постановить на ноги сестер. Восстанавливал родной колхоз имени Ильича. Долгое время был бригадиром полеводческой бригады и избирался депутатом Брылевского сельского совета. Вместе с супругой Яниной Станиславовной Недвецкой дал путевку в жизнь трем сыновьям и дочери. Старшего сына Казимир Брониславович назвал в честь брата супруги Антона Антоновича Недвецкого, летчика-бомбардировщика, полковника, участника Великой Отечественной войны. Четверо братьев Янины Станиславовны не вернулись с этой войны. Старшему, генералу Вячеславу Ивано-

Казимир Брониславович Волков

вичу Недвецкому, было 38 лет, а ефрейтору Василию Антоновичу лишь 18.

Моему отцу Антону Казимировичу Волкову пришлось быть участником кровавых событий в Чехословакии в 1968 году, где он находился в составе спортивной роты спецназначения. Всю свою жизнь посвятив спорту и воспитанию подрастающего поколения, он более 20 лет отработал в средней школе № 5 г. Могилева, а последние 15 лет возглавляет кафедру физвоспитания Могилевского областного технологического лицея № 2.

Отслужили в рядах советской армии и двое младших сыновей Казимира Брониславовича: Олег Казимирович – в танковых войсках, сегодня трудится на заводе имени С.М.Кирова сварщиком; Александр Казимирович служил в десантно-штурмовой бригаде, а сейчас работает термистом на МПО «Химволокно» имени В.И.Ленина, оба передают свой трудовой опыт молодежи.

Увидеть войну пришлось и мне, старшему в роду правнуку Георгиевского кавалера, Игорю Антоновичу Волкову. Такая, вид-

Антон Казимирович Волков

но, судьба старшего в своем поколении…

...Шел 1989 год. Советский Союз раздирали локальные конфликты. Свою срочную службу я проходил в элитном 300-м полку Воздушно-десантных войск, который дислоцировался в горячих точках Закавказья и Приднестровья. Командовал полком гвардии полковник Калмыков, ныне генерал, командующий ВДВ России. Заместителем командира полка

Игорь Антонович Волков

был гвардии майор Шаманов, ныне Герой России, генерал, губернатор Ульяновской области...

Иногда, как мой дед и отец, я писал письма своей прабабушке Анне Станиславовне. А она, будучи неграмотной, брала письмо, выходила на улицу и говорила прохожему: *«Вот внучок письмо прислал с карточкой, прочти, пожалуйста, а то мои глаза плохо видят»...*

Когда я уходил в армию, в уголочке платка был зашит медальон Божьей Матери, который дала мне бабушка Янина Станиславовна, -- с этим медальоном прошли армию все мужчины в нашем роду.

Недавно вернулся из вооруженных сил Республики Беларусь мой двоюродный брат Максим Александрович Волков. В столичном Белгосуниверситете осваивает науку Антон Олегович Волков. Все растут достойными сыновьями своих отцов и дедов.

А в деревне Каменка Брылевского сельсовета живёт Евгения Брониславовна Недвецкая (Волкова) (в народе *бабушка Женя*), живой свидетель истории родной стороны. Всегда добрая и приветливая, она непременно угостит Вас свежим молоком. В трудную минуту она всегда была

Антон Игоревич Волков

рядом со своими родственниками. Спасибо Вам, бабушка Женя, за Вашу доброту !..

В роду Волковых-Карачевских появился представитель нового поколения, продолжатель рода – Волков Антон Игоревич. Он родился в один день со своим прапрадедом – 16 августа. Хотя ему нет еще и двух лет, он уже по-серьезному смотрит на мир, важно носит на шее вместе с крестиком родовое кольцо, которое принадлежит старшему в нашем роду, которое его прадед пронес через годы войны и которое он передаст уже своему сыну.

К сожалению, не дожил до очередной годовщины Победы Казимир Брониславович Волков. Но годы не затмят нашу память, не затмят наш старожитно-шляхетский род Волковых-Карачевских, служивших и укрепляющих Отечество наше.

Игорь ВОЛКОВ.



Часопіс "Полымя" у № 9, 2008 г. змясціў на сваіх старонках нізку вершаў члена Саюза беларускіх пісьменнікаў, дырэктара Брылеўскага сельскага Дома культуры Міколы ЯЦКОВА. Прапануем вашай увазе адзін з вершаў:

Ніколі не скажа лёс,
Што будзе наперадзе, там.
Ён сёння сустрэчу прынёс,
І нешта ён шэпча нам.
І неяк складзе шляхі,
І зробіць малюнак свой,
І нешта насыпе ў мяхі,
І свой развіне сувой.
Ды толькі не зведаем мы,
Калі той надыдзе час --
І ўжо надыход зімы
Не здзівіць урэшце нас...



Газета Веснік Магілёва" 26 верасня 2008 г. надрукавала песню "Битва под Лесной" (верш А.Пушкіна і І.Пехцерава, музыка М.Яцкова), прысвечаную 300-годдзю вядомай руска-шведскай бітвы ля вёскі Лясная (Слаўгарадскі раён).

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

АБЯРЭГІ Ў ДАРОГУ

Народная газета
9.09.2008 г.

Каб у дарозе абараніць сябе, сваіх родных, хатнюю жывёлу, у народзе існавала вялікая колькасць магічных дзеянняў, замоў і абярэгаў.

- Перад далёкай дарогай чалавек жадаў атрымаць падтрымку сакральнага месца ў хаце -- стала, тройчы пацалаваўшы яго. Стол цалавалі і пасля вяртання дадому. Перад тым, як адправіць маладых у храм, бацька нявесты тройчы па сонцы абводзіў іх вакол стала.
- Ідучы ў далёкую дарогу, з сабой бралі жменю роднай зямлі, якая будзе "сцерагчы, дапамагаць" у цяжкія моманты. Пры гэтым казалі так: *"Радзімая хата, радзімая зямля, зберагайце раба Божага (імя) на шляхах-дарогах".*
- У час вяселля перад маладымі мялі дарогу, а венік выкідалі далёка ад хаты. Лічылася, калі на дарозе былі закапаны рэчы, накіраваныя на разлуку маладых, венік возьме на сябе гэтую інфармацыю.
- Каб маладых не зачаравалі ў дарозе, як яны ехалі да вянца, то як толькі яны выязджалі з двара, у варотах клалі салому і запальвалі яе ды пераязджалі цераз той агонь. Тым яны ўжо гартаваліся і не баяліся ніякіх чараў.

Цытата

Сябрам пакінь утрая больш, чым сабе. Для сябе захавай галоўнае: хоць бы крупінку чыстага сэрца.

Хун Цзычэн (XII ст.), кітайскі пісьменнік.

ЗВЯЗДА
30.09.2008 г.

Сапраўдным эліксірам бессмяротнасці кітайцы лічаць сем кубкаў чаю штодня.

У лісцях чайнага дрэва утрымліваецца звыш 300 розных карысных рэчываў. Любімы многімі напой павышае гемаглабін, актывізуе работу печані, селязёнкі, узбагачае арганізм вітамінам С, выводзіць з яго таксіны. Вельмі моцны і салодкі свежы чай з малаком дапамагае пры атручваннях алкаголем, лекавымі прэпаратамі, а проста салодкі чай можа выратаваць пры галаўных болях. Ахалоджаны настой сумесі зялёнага і чорнага чаю з дабаўленнем невялікай колькасці вінаграднага сухога віна (1 чайная лыжка на 1 шклянку) -- сродак ад кан'юнктывіту. Расцёрты ў парашок сухі чай дапамагае пры лячэнні апёкаў.

Мы с Сидоровым ходили на свадьбу. Сидоров подарил молодожёнам телевизор, а я - программу на неделю. Прошло три дня -- и что же? Телевизор уже гикнулся, а программа всё ещё действует!

Прозвішча падпісчыка

рух - гэта жыццё !



4 верасня 2008 г.

У свае 77 год Ілля Мяфодавіч БУГЛАКОЎ ніколі не развітваецца са сваім надзейным сябрам -- веласіпедам. І Любоў Якаўлеўна ПУХАЛЕНКА лічыць, што, негледзячы на два колы, гэта вельмі зручны і надзейны транспартны сродак.

Доўгачаканы рамонт



На пачатку верасня брыгада “Жылкамгаса” зрабіла ўрэшце рэшт запланаваны рамонт даху на доме № 6 па вул.Юбілейнай у Брылях. На пэўны тэрмін дажджы не будуць нерваваць туташніх жыхароў.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 299 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ